# Справаздача аб дасягнутым прагрэсе, 2019

**ААТ «Савушкін прадукт»**



# ЗМЕСТ


03 Зварот генеральнага дырэктара

04 «Савушкін прадукт» сёння

18 «Савушкін прадукт» — адказны працадаўца

28 Ахова навакольнага асяроддзя

33 Супрацьдзеянне карупцыі

35 Сацыяльна адказны бізнес

# ЗВАРОТ ГЕНЕРАЛЬНАГА ДЫРЭКТАРА

***Дарагія сябры!***

ААТ “Савушкін прадукт” — кампанія, якая развівае свой бізнес, кіруючыся прынцыпамі сацыяльнай адказнасці. Нягледзячы на імклівае развіццё рынку, нашы асноўныя прынцыпы і каштоўнасці вось ужо больш за 40 гадоў застаюцца нязменнымі, накіраванымі на стварэнне і клопат аб людзях. Мы няўхільна прытрымліваемся сваёй місіі: дарыць радасць і здароўе, выпускаючы натуральную малочную прадукцыю для здаровага харчавання.

У цэнтры ўвагі нашага бізнесу — клопат пра спажыўцоў, ахова навакольнага асяроддзя, адказнае стаўленне да людзей, партнёраў і супрацоўнікаў нашай кампаніі, захаванне іх правоў і сумленнае празрыстае вядзенне бізнесу. З'яўляючыся лідэрам малочнай індустрыі Беларусі, мы працуем з адказнасцю дзеля таго, каб кожны наш крок адпавядаў сусветным стандартам вядзення бізнесу.

Сёння мы прадстаўляем вашай увазе нашу чарговую “Справаздачу аб дасягнутым прагрэсе за 2019 год”, у якой знайшлі сваё адлюстраванне найважнейшыя сацыяльна-адукацыйныя і дабрачынныя праекты, рэалізаваныя нашай кампаніяй. А таксама ўсё тое, што нам удалося зрабіць, каб свет, людзі і наша навакольнае асяроддзе сталі яшчэ лепш.



Аляксандр Саўчыц,
генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт»



# «Савушкін прадукт» сёння

# КАМПАНІЯ Ў ЛІЧБАХ

**1 150 000**
тон малака **перапрацавана** ў 2019 годзе

**3**
уласныя сельгаспрад-прыемствы

**9**
вытворчых пляцовак

Больш за **3 100**
сярэдні аб'ём малака, якое парапрацоўваецца за суткі

**6 286**
супрацоўнікаў

**50**
мільёнаў даляраў — аб'ём укладзеных інвестыцый за 2019 год

Больш за **650**
узнагарод

**3** — наша вытворчасць падзелена на 3 зоны (зялёную, жоўтую і чырвоную) па ступені рызыкі магчымага забруджвання прадукту

## Сярэднясутачныя аб'ёмы выпуску прадукцыі

Больш за **1 200**
тон ЦМП

**43**
тоны сметанковага масла

Больш за **140**
тон сыроў

**130**
тон сыроваткі

**16**
тон сокавай прадукцыі

# САВУШКІН ПРАДУКТ СЁННЯ

ААТ «Савушкін прадукт» — адзін з найбуйнейшых вытворцаў натуральнай малочнай прадукцыі Усходнееўрапейскага рэгіёна. Узначальвае рэйтынг кампаній харчовай прамысловасці Рэспублікі Беларусь, якія працуюць найбольш эфектыўна. Уваходзіць у тройку найбуйнейшых малочных кампаній СНД і Расіі.

На працягу ўсёй сваёй дзейнасці мы займаемся высакародным бізнесам: забяспечваем людзей малочнай прадукцыяй, рэгулярнае ўжыванне якой дапамагае ўмацоўваць сваё здароўе. Кампанія заўсёды арыентуецца на якасць і натуральнасць.



ААТ «Савушкін прадукт» — адзін з найбуйнейшых вытворцаў натуральнай малочнай прадукцыі Усходнееўрапейскага рэгіёна

# ГРУПА КАМПАНІЙ




Група кампаній "Савушкін прадукт" аб'ядноўвае 9 вытворчых пляцовак — высокатэхналагічных заводаў еўрапейскага ўзроўню.

Кожная з пляцовак мае сваю спецыялізацыю:

- у Брэсце выраблявецца цэльнамалочная прадукцыя, сухая сыроватка ў асартыменце і сокавая прадукцыя;
- у Пінску — сыры (цвёрдыя і плаўленыя), сметанковае масла і СМП, тут жа ажыццяўляецца нарэзка (брусок і слайсер) і фасоўка сыроў;
- Вытворчыя філіялы ў Століне, Камянцы і Копысі спецыялізуюцца на выпуску сыроў;
- У Бярозе выпускаюцца сыры і цэльнамалочная прадукцыя.
- Завод у Оршы пасля завяршэння глабальнай мадэрнізацыі ў канцы вясны — пачатку лета 2020 года будзе спецыялізавацца на выпуску свежых сыроў.

Сукупны сярэднясутачны аб'ём перапрацоўкі малака па 2019 годзе перавысіў 3100 тон у суткі.

# ПРАДУКЦІЯ КАМПАНІІ




Кампанія выпускае каля 350 найменняў прадукцыі

Кампанія выпускае каля 350 найменняў прадукцыі пад брэндамі «Савушкин», «Брест-Литовск», «Teos», «Оптималь», «СуперКид», «Сыры из Александрии», «Апети», «Ласковое лето», «Березка», «Активил» і «На100ящий».

Уся малочная прадукцыя выпрацоўваецца выключна з высакаякаснага каровінага малака. Для таго, каб гарантаваць якасць і бяспеку вырабляемай прадукцыі, мы закупляем толькі найлепшую малочную сыравіну з экалагічна чыстых рэгіёнаў.

У кампаніі прымяняюцца найлепшыя ў сусветнай малочнай індустрыі тэхналогіі вытворчасці, якія дазваляюць забяспечваць даволі працяглыя тэрміны прыдатнасці натуральных малочных прадуктаў без прымянення кансервантаў пры строгім выкананні тэмпературных рэжымаў транспартавання і захоўвання ад +2 да +6 °С.

## КЛЮЧАВЫМІ ФАКТАРАМІ СТАБІЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ ААТ «САВУШКІН ПРАДУКТ» З'ЯЎЛЯЮЦЦА:

● слушная інвестыцыйная палітыка;
● высакаякасная малочная сыравіна;
● строгая сістэма кантролю якасці прадуктаў;
● выпуск канкурэнтаздольных натуральных прадуктаў без кансервантаў;
● шырокі асартыментны партфель, 11 моцных брэндаў;
● уласная тавараправодная сетка;
● добрая транспартная лагістыка;
● дыверсіфікацыя рынкаў збыту;
● клопат пра людзей і навакольнае асяроддзе.



# ІНВЕСТЫЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА



Інвестыцыйная палітыка кампаніі накіравана на пастаяннае тэхнічнае перааснашчэнне вытворчасці і ўкараненне самых сучасных тэхналагічных працэсаў. Гэта гарантуе стабільна высокую якасць вырабляемых у кампаніі прадуктаў харчавання, а таксама выпуск натуральных малочных прадуктаў з доўгімі тэрмінамі прыдатнасці без прымянення кансервантаў. Кіраванне тэхналагічнымі працэсамі на вытворчасці цалкам камп'ютарызавана. Адсутнасць кантакту малака ў працэсе вытворчасці са знешнім асяроддзем дазваляе гарантаваць максімальную бяспеку прадуктаў і станоўча адбіваецца на якасці гатовай прадукцыі.

Мы пастаянна працуем у кірунку нарошчвання вытворчых магутнасцяў, закупляючы найноўшае высокатэхналагічнае абсталяванне, якое дазваляе выключыць ручную працу і палегчыць працу супрацоўнікаў на ўсіх участках вытворчага працэсу.

На вытворчых пляцоўках кампаніі праводзіцца бесперапынная мадэрнізацыя, ставіцца новае абсталяванне, укараняюцца сучасныя тэхналогіі.

У 2019 годзе ў ходзе мадэрнізацыі вытворчага філіяла ў Бярозе былі ўсталяваныя лінія вытворчасці глазураваных сыркоў, абсталяванне цэнтралізаванай мыйкі, аўтамат фасоўкі тварагу і ўпакоўкі фасаванага тварагу ў плёнку.

У Пінску на вытворчасці ўстаноўленыя аўтаматычная лінія для ўпакоўкі сыроў у тэрмаўсаджвальную плёнку ў мяккім і цвёрдым вакууме, машына для парцыённай рэзкі сыру, аўтаматычная ўпаковачная машына, упаковачны аўтамат для фасоўкі масла.

# ІНВЕСТЫЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА



Уся прадукцыя выпускаецца на сучасным вытворчым абсталяванні ад вядучых сусветных вытворцаў

На філіяле ў Століне ў мінулым годзе ўведзеныя ў дзеянне ўстаноўка нанафільтрацыі для канцэнтрацыі і частковай дэмінералізацыі сыроваткі, пастэрызацыйная ўстаноўка для сыроваткі, цэнтрабежны сепаратар для сыроваткі.

У Брэсце ўстаноўленыя аўтамат для фасоўкі смятаны, аўтамат Hassia, аэратар бесперапыннага дзеяння, стужачны транспарцёр, устаноўка ультрафільтрацыі, камплект абсталявання для ўчастка дазавання і астуджэння з сістэмай кіравання і тэрмізатарам і г.д.

Уся прадукцыя выпускаецца на сучасным вытворчым абсталяванні ад вядучых сусветных вытворцаў, у ліку якіх Tetra Pak, Westfalia, Grunwald, Alfa Laval, Obram, Bosch, General Electric (GE) і інш.



## МІСІЯ КАМПАНІІ
## «ДАРЫЦЬ ЛЮДЗЯМ РАДАСЦЬ І ЗДАРОЎЕ!»

### Каштоўнасці кампаніі:

● лідарства (імкненне быць найлепшымі ў сваёй справе)
● якасць (кожны супрацоўнік вынікам сваёй працы ўплывае на якасць і бяспеку прадукцыі)
● адказнасць (пільная ўвага да бяспекі вырабляемых прадуктаў)
● сумленная і адкрытая палітыка вядзення бізнесу (арыентацыя на патрэбы спажыўца, першакласны сэрвіс, натуральнасць і высокая якасць прадукцыі)
● партнёрства (неабыякавасць і ўцягнутасць: мы працуем адзінай камандай)
● беражлівыя адносіны да людзей (людзі — галоўная каштоўнасць кампаніі)
● прафесіяналізм (мы цэнім прафесійнае майстэрства нашай каманды і ўклад кожнага супрацоўніка ў развіццё кампаніі)
● незалежнасць (кожны супрацоўнік вольны ў прыняцці рашэнняў у рамках сваёй кампетэнцыі)

# ВЫСАКАЯКАСНАЯ МАЛОЧНАЯ СЫРАВІНА



ВАЖНА!
95% усяго малака, якое паступае ў кампанію на перапрацоўку, адпавядаюць гатунку "экстра" і найвышэйшаму гатунку

Уся малочная прадукцыя ў кампаніі вырабляецца са свежага каровінага малака без выкарыстання штучных напаўняльнікаў і без ужывання кансервантаў. "Савушкін прадукт" за ўсю гісторыю існавання ніводнага дня не працаваў на сухім адноўленым малацэ.

Якасць і смак выпускаемай прадукцыі шмат у чым залежаць ад якасці сыравіны. Кампанія "Савушкін прадукт" закупляе малочную сыравіну толькі ў надзейных і добрасумленных пастаўшчыкоў. Працай над павышэннем якасці малака і прадуктыўнасці дойнага статку ў кампаніі займаецца упраўленне па развіцці сельскай гаспадаркі.

Сыравінную зону кампаніі складаюць больш за 150 гаспадарак, а гэта 450 малочна-таварных ферм. Многія з іх размешчаныя паблізу Нацыянальнага парка "Белавежская пушча", што кажа аб экалагічнай чысціні сыравіны. У 2019 годзе кампанія перапрацавала каля 1 150 000 тон малака.

"Савушкін прадукт" строга кантралюе і гарантуе камфортныя ўмовы ўтрымання жывёлы, збалансаваны рацыён яе харчавання, а таксама забяспечвае правільнае лячэнне кароў. Дзякуючы асаблівым еўрапейскім тэхналогіям беспрывязнага ўтрымання жывёлы, нам удалося пазбегнуць ярка выяўленага сезоннага вагання ў аб'ёмах малака, якое паступае на перапрацоўку. Гэта і забяспечвае магчымасць кампаніі круглы год працаваць толькі на цэльным каровіным малацэ.

Перш чым патрапіць на перапрацоўку, кожная партыя малака праходзіць пільны лабараторны аналіз. Першы тэст на якасць — у самой гаспадарцы. Сыравіна, якая паспяхова прайшла праверку, накіроўваецца ў стэрыльныя цыстэрны фірмавых малакавозаў, якія адразу ж апламбоўваюцца і адпраўляюцца на "Савушкін прадукт".

# СІСТЭМА КАНТРОЛЮ ЯКАСЦІ

Наша кампанія кантралюе якасць малака на ўсім шляху яго руху ад каровы да прылаўка крам, так што спажыўцы могуць быць упэўненыя: яны выбіраюць найлепшае для сябе і сваіх блізкіх.

Уся сыравіна, перш чым патрапіць на вытворчасць, праходзіць строгую праверку: на прадпрыемстве пробы сыравіны адпраўляюцца ў лабараторыю ўваходнага кантролю. *Гэта праверка на адпаведнасць 50-ці неабходным параметрам якасці і бяспекі.*

На праверку адной партыі малака сыходзіць не больш за 20 хвілін. Сучаснае лабараторнае абсталяванне, якое прымяняецца на ўсіх вытворчых пляцоўках, дазваляе правесці аналіз малака ў мінімальны тэрмін: вызначыць масавую долю тлушчу, бялку, лактозы, яго кіслотнасць, бакабнасеньванне, колькасць саматычных клетак. Уся сыравіна ў абавязковым парадку правяраецца на наяўнасць рэшткавага ўтрымання антыбіётыкаў, пестыцыдаў, мікатаксінаў і г.д. Нават пры мінімальным адхіленні ад нормаў малако разам з суправаджальным лістом вяртаецца пастаўшчыку.

Пасля таго, як якаснае малако па трубах сышло на вытворчасць, цыстэрна малакавоза мыецца, апрацоўваецца гарачай парай, апламбоўваецца і накіроўваецца за новай партыяй свежага каровінага малака!

У нас ажыццяўляецца строгі ўваходны кантроль не толькі ўсёй сыравіны, якая паступае на прадпрыемства, але таксама тары і ўпакоўкі.

Сучаснае абсталяванне і вельмі высокі ўзровень вытворчай культуры кампаніі “Савушкін прадукт” дазваляюць выпускаць гарантавана якасную і бяспечную прадукцыю. Лабараторыі кампаніі ажыццяўляюць строгі кантроль за ходам усяго тэхналагічнага працэсу, правяраюць адпаведнасць гатовай прадукцыі заяўленым фізіка-хімічных паказчыкам і даюць дазвол на адпраўку якаснай гатовай прадукцыі ў гандлёвыя сеткі.



Толькі 100%-на якаснае малако паступае на вытворчасць

# СІСТЭМА КАНТРОЛЮ ЯКАСЦІ

Наша кампанія як вытворца, які паважае сябе і клапоціцца пра здароўе спажыўцоў, ведае і выконвае правілы бяспечнай арганізацыі ўсіх вытворчых працэсаў. Для забеспячэння высокай якасці і бяспекі выпускаемых прадуктаў харчавання ў нашай кампаніі ўкаранёныя і дзейнічаюць наступныя сістэмы менеджменту:






- сістэма менеджменту якасці вытворчасці харчовых прадуктаў, сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням СТБ ISO 9001-2015;

- сістэма менеджменту бяспекі харчовых прадуктаў, сертыфікавана па міжнароднай схеме сертыфікацыі FSSC 22000;

- сістэма кіравання навакольным асяроддзем (СКНА), якая ўключае нацыянальны экалагічны сертыфікат адпаведнасці СТБ ІСО 14001 і міжнародны экалагічны сертыфікат адпаведнасці ISO 14001.

# ЛАГІСТЫКА І ЎЛАСНАЯ ТАВАРАПРАВОДНАЯ СЕТКА




Цікава:
На загрузку адной 20-тоннай фуры сыходзіць каля 30-ці хвілін!

Партыі гатовых прадуктаў, атрымаўшы якасны сертыфікат, пасля дэгустацыйнага і чарговага лабараторнага кантролю паступаюць ва ўнікальны ў сваім родзе лагістычны цэнтр. Тут цалкам аўтаматызаваны працоўны працэс. Заказы камплектуюцца на аўтаматызаваных лініях. Улік гатовай прадукцыі вядзецца ў онлайн-рэжыме. Гэта дазваляе бачыць рэальныя рэшткі прадукцыі на складзе і з улікам гэтага фармаваць карэктныя адгрузкі. Выключэнне чалавечага фактару дазваляе пазбегнуць памылак.

Прадукцыя загружаецца ў аўтамабілі-рэфрыжэратары і дастаўляецца ў гандлёвыя філіялы і сеткі супермаркетаў пры тэмпературы ад +2 да +6 градусаў. Так кампанія цалкам кантралюе халадовы ланцужок: ад сыравіны да прылаўка.

Наша кампанія мае ўласную таваразправодную сетку: гандлёвыя філіялы ва ўсіх абласцях Рэспублікі Беларусь і ў Пінску, а таксама гандлёвае прадстаўніцтва ў Расіі. Інтарэсы кампаніі за мяжой таксама прадстаўляюць шматлікія партнёры. Дзякуючы гэтаму, у нашай кампаніі правільна адладжана лагістыка. Гэта дазваляе своечасова ажыццяўляць пастаўкі прадукцыі ва ўсе гандлёвыя сеткі.

# ЭКСПАРТНЫЯ ПАСТАЎКІ

Гарантам высокай якасці і бяспекі вырабляемай прадукцыі з'яўляецца наяўнасць у кампаніі “Савушкін прадукт” бестэрміновай экспартнай ліцэнзіі на права паставак усяго асартыменту прадукцыі ў краіны Еўрасаюза.

Дарэчы, наша кампанія адзіная з малочных прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь з ліпеня 2013 года ажыццяўляе рэгулярныя пастаўкі традыцыйнай малочнай прадукцыі і яе дэсертнай групы ў краіны Еўрасаюза. І гэта не толькі гарантыя якасці, але і добрая рэпутацыя вытворцы, які ўмее трымаць планку натуральнасці, бяспекі і экалагічнасці гатовага прадукту.

Экспартны рынак кампаніі налічвае больш за 30 краін свету. Сярод іх: **Расія, Казахстан, Азербайджан, Украіна, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Іарданія, Сінгапур, Паўднёвая Карэя, Ізраіль, краіны ЕС, КНР і Японія.**

Тэмп росту экспартных паставак у 2019 годзе да 2018 года ў доларавым эквіваленце склаў 116,7%.




**ВАЖНА!**
По выніках 2019 года ўдзельная вага экспарту ў агульным аб'ёме продажаў склала 59,1%.




# «Савушкін прадукт» - адказны працадаўца

2



**Прынцыпы карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, працоўныя адносіны, забеспячэнне камфортных умоў працы ў кампаніі “Савушкін прадукт” — найважнейшыя складнікі паспяховай работы прадпрыемства і атрымання высокіх вынікаў. Наша кампанія ў сваёй працы кіруецца міжнароднымі прынцыпамі ў галіне працоўных адносін:**

- дзелавыя колы павінны падтрымліваць свабоду аб'яднання і рэальнае прызнанне права на заключэнне калектыўных дагавораў;
- дзелавыя колы павінны выступаць за ліквідацыю ўсіх формаў прымусовай і абавязковай працы;
- дзелавыя колы павінны выступаць за поўнае выкараненне дзіцячай працы;
- дзелавыя колы павінны выступаць за ліквідацыю дыскрымінацыі ў сферы працы і занятасці.

# «САВУШКІН ПРАДУКТ» У ЛІЧБАХ

**6286** людзей

**38** гадоў

**2116000** даляраў

**174000** даляраў

**290000** даляраў



колькасць супрацоўнікаў кампаніі



сярэдні ўзрост калектыву




сацыяльны пакет за 2019 год



інвестыцыі ў навучанне і павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў кампаніі (2019 г)



накіравана на забеспячэнне годнага медыцынскага абслугоўвання для супрацоўнікаў кампаніі (2019 г)

# САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ

Быць супрацоўнікам кампаніі — значыць працаваць у камандзе аднадумцаў, для якіх прафесіяналізм і самааддача з'яўляюцца агульнымі безумоўнымі прыярытэтамі.

У кожнага супрацоўніка ёсць магчымасць у рамках кампаніі атрымліваць гарачае харчаванне і медыцынскае абслугоўванне, наведваць стаматалагічныя і масажныя кабінеты. У Брэсце і на вытворчых філіялах штодня працуюць здраўпункты, у якіх медыцынскія паслугі аказваюцца бясплатна.

Кампанія ўлічвае інтарэсы і захапленні кожнага члена калектыву. Супрацоўнікі бясплатна наведваюць спартыўна-трэніровачную залу і басейн, ходзяць на спектаклі і канцэрты. Прафсаюзная арганізацыя кампаніі “Савушкін прадукт” дае магчымасць развівацца фізічна і духоўна, а таму ладзіць мноства культурна-масавых мерапрыемстваў, сярод якіх — экскурсійна-турыстычныя паездкі выхаднога дня, карпаратыўныя святы, Дні здароўя, турзлёты, тымбілдынгі.

Кампанія дае кожнаму магчымасць набываць новыя веды і развівацца прафесійна. Дзякуючы дзеючай праграме бесперапыннага прафесійнага навучання, для супрацоўнікаў рэгулярна арганізуюцца карпаратыўныя трэнінгі, а таксама паездкі на міжнародныя прафесійныя канферэнцыі, навучальныя семінары і курсы павышэння кваліфікацыі.

У кампаніі “Савушкін прадукт” дзейнічае Калектыўны дагавор — адзін з найлепшых у Беларусі. Калектыўны дагавор — гэта дакумент, які ўстанаўлівае дадатковыя сацыяльныя гарантыі, кампенсацыі і льготы для супрацоўнікаў кампаніі. Дзякуючы яму, кожны супрацоўнік кампаніі, член прафсаюза, можа разлічваць на атрыманне матэрыяльнай дапамогі і месца ў інтэрнаце, кампенсацыю выдаткаў на медабслугоўванне, пуцёўку ў санаторый для дарослых і да т.п. Калектыўны дагавор ахоплівае таксама найважнейшыя пытанні ў галіне аплаты працы, занятасці работнікаў, аховы працы, вытворчай і экалагічнай бяспекі, медыцынскага абслугоўвання, санаторна-курортнага лячэння і забеспячэння жыллём.



У кампаніі “Савушкін прадукт” дзейнічае Калектыўны дагавор — адзін з найлепшых у Беларусі

**ВАЖНА!**

прафсаюзная арганізацыя “Савушкін прадукт” уключае ў сябе 99,9% супрацоўнікаў кампаніі

# АХОВА ПРАЦЫ



Асноўны прынцып і галоўная задача аховы працы ў нашай кампаніі — захаванне гэтых каштоўнасцей шляхам прадухілення вытворчага траўматызму і прафесійнай захваральнасці

Немагчыма ўявіць сабе штосьці больш каштоўнае і важнае, чым жыццё і здароўе чалавека. Асноўны прынцып і галоўная задача аховы працы ў нашай кампаніі — захаванне гэтых каштоўнасцей шляхам прадухілення вытворчага траўматызму і прафесійнай захваральнасці, а таксама стварэнне камфортных умоў працы.

Для гэтага ў нашай кампаніі распрацавана і дзейнічае палітыка ў галіне аховы здароўя і бяспекі працы ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандарту OHSAS 18001, якая накіравана на стварэнне неабходных умоў па забеспячэнні бяспекі працы ў цэлым, падтрымку бяспекі працы на рабочых месцах, прадухіленне выпадкаў траўматызму і ўзнікнення аварый. і забеспячэння жыллём.

# АХОВА ПРАЦЫ






У 2019 годзе згодна з планам мерапрыемстваў па ахове працы, які з'яўляецца дадаткам да Калектыўнага дагавора, выканана 27 мерапрыемстваў, у тым ліку:

• замена сістэмы кандыцыянавання паветра на больш прадуктыўную ў мыйным аддзяленні цэха па вытворчасці мяккіх сыроў і тварагу;
• замена асвятлення на LED-лямпы ў камерах паспявання сыру і ў сырасховішчы ў Століне, у цэхах асноўнай вытворчасці ў Пінску;
• набыта перасоўная пляцоўка для абслугоўвання абсталявання кацельнага цэха;
• набыты камплект страховачнага рыштунку для арганізацыі работ унутры падземных калодзежаў персаналам службы водазабеспячэння і кандыцыянавання;
• мадэрнізацыя сістэмы вентыляцыі ў мікрабіялагічнай і хімічнай лабараторыі ў Століне і інш.

Работнікі кампаніі забяспечваюцца бясплатнымі сродкамі індывідуальнай абароны, выдаюцца сродкі для змывання і абеззаражвання. Усе работнікі забяспечаны бутыляванай вадой.

У кожным падраздзяленні нашай кампаніі праводзіцца ідэнтыфікацыя небяспек і ацэнка рызык. На кожную рызыку распрацоўваюцца і выконваюцца папераджальныя дзеянні, што дазваляе папярэдзіць узнікненне выпадкаў траўматызму.

Штогод праводзіцца навучанне па ахове працы:
• пры выкананні будаўнічых, шынамантажных работ;
• пры выкананні вышынных і земляных работ;
• пры рабоце з хімічнымі рэчывамі;
• пры рабоце на мабільных рабочых платформах;
• з грамадскімі інспектарамі па ахове працы;
• па сістэмах кіравання навакольным асяроддзем;
• па сістэме менеджменту аховы здароўя і бяспекі працы і г.д.

# ІНФАРМАВАННЕ СУПРАЦОЎНІКАЎ

Кампанія “Савушкін прадукт” развівае старонкі ў сацыяльных сетках Вконтакте, Instagram, Facebook, Одноклассники. Інфармацыя, размешчаная ў акаўнтах і на афіцыйным сайце кампаніі, даступная як супрацоўнікам, так і іншым наведвальнікам.

Карпаратыўны сайт кампаніі “Савушкін прадукт” змяшчае поўную інфармацыю аб прадпрыемстве, прадукцыі, актуальныя падзеі ў жыцці арганізацыі, гісторыі развіцця і інш. Таксама для супрацоўнікаў кампаніі працуе ўнутрыкарпаратыўны партал sps, дзе размешчаны ўнутраныя дакументы кампаніі.




Унутрыкарпаратыўнае жыццё кампаніі публічнае і адкрытае для ўсіх супрацоўнікаў кампаніі і зацікаўленых асоб

У кампаніі выдаецца карпаратыўны часопіс “Савушкін magazine”. Асноўныя вехі, падзеі, выбітныя людзі, святы і будні “Савушкін прадукт” знаходзяць сваё адлюстраванне на старонках карпаратыўнага выдання, якое выходзіць у свет з 2008 года (спачатку як газета, а з 2019 года ў фармаце часопіса).




Актуальныя інфармацыйныя матэрыялы пра падзеі і пытанні ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці краіны, рэгіёна і кампаніі размяшчаюцца на стэндах у адміністрацыйным корпусе, цэхах, інтэрнатах, на ўсіх вытворчых і гандлёвых філіялах, на электронных маніторах, з дапамогай электроннай рассылкі ўсім супрацоўнікам.



# КАРПАРАТЫЎНАЯ СПАРТАКІЯДА

“Савушкін прадукт” — кампанія, якая клапоціцца пра здароўе сваіх супрацоўнікаў. Гэты напрамак дзейнасці кампаніі разам з культурна-масавай працай у калектыве заўсёды застаецца прыярытэтным. Заняткі спортам — гэта залог добрага самаадчування і настрою супрацоўнікаў, а значыць, іх высокай працаздольнасці і эфектыўнасці працы.

Спартакіяда ўключае ў сябе спаборніцтвы ў самых разнастайных відах спорту з улікам featured розных інтарэсаў супрацоўнікаў: лёгкая атлетыка, бадмінтон, валейбол, міні-футбол, настольны тэніс, шашкі і шахматы, плаванне, більярд, петанк і дартс.






У 2019 годзе “Савушкін прадукт” у 4-ы раз правёў круглагадовую карпаратыўную спартакіяду сярод усіх вытворчых і гандлёвых філіялаў кампаніі. Гэта 9 каманд з розных падраздзяленняў і філіялаў кампаніі, каля 500 супрацоўнікаў-удзельнікаў і столькі ж балельшчыкаў.

Па выніках усіх спаборніцкіх этапаў спартакіяды лідарам стала каманда вытворчасці. Другое месца заняла каманда ўпраўлення продажаў і служб лагістыкі, а трэцяе — каманда дапаможных служб.

# КАМАНДНЫ ДУХ



Вялікую ўвагу “Савушкін прадукт” надае фармаванню карпаратыўнага духу калектыву кампаніі. У 2019 годзе для супрацоўнікаў была арганізавана паездка ў парк гісторыі Сула, Нацыянальны парк “Белавежская пушча”, Рэзідэнцыю Дзеда Мароза і г.д. Былі арганізаваны мерапрыемствы, прысвечаныя Дню сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу, Дню абаронцаў Айчыны і Міжнароднаму жаночаму дню.

У канцы снежня 2019 года ў кампаніі “Савушкін прадукт” быў запушчаны конкурс дзіцячага малюнка “Навагодняя казка з “СуперКідам”. Удзельнікі конкурса — дзеці супрацоўнікаў кампаніі ад 4 да 12 гадоў. Па выніках конкурса на падставе онлайн-галасавання супрацоўнікамі кампаніі былі вызначаны пераможцы ў трох узроставых катэгорыях. Для ўдзельнікаў і іх бацькоў было арганізавана святочнае мерапрыемства. Усе канкурсанты атрымалі падарункі і сувеніры. Такія мерапрыемствы і конкурсы вельмі добра аб'ядноўваюць калектыў і ўмацоўваюць камандны дух.

У кампаніі “Савушкін прадукт” кожны супрацоўнік ведае, што ў любой складанай сітуацыі яго падтрымаюць і дапамогуць. Ужо два гады запар у нашай кампаніі дзейнічае гадавая ўнутрыкарпаратыўная акцыя “Час дарыць дабро”. Напярэдадні калядных святаў супрацоўнікі збіраюць сродкі для аказання дабрачыннай дапамогі сваім калегам, якія самі або члены іх сем'яў сутыкнуліся з хваробай і апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. У 2019 годзе была аказана дапамога 12 супрацоўнікам. Дапамога была выдзелена на закупку дарагіх медыцынскіх прэпаратаў і абсталявання, лячэнне і рэабілітацыю. Акцыя ў кампаніі праводзіцца на пастаяннай аснове.

Кампанія “Савушкін прадукт” памятае пра кожнага свайго супрацоўніка. Штодня на электронных маніторах кампаніі размяшчаюцца віншаванні з Днём нараджэння супрацоўнікаў, а таксама з нагоды розных святаў і ўзнагарод. Гэта такія святы як 8 Сакавіка, Дзень абаронцаў Айчыны, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці, Дзень Маці, прафесійнае свята, Новы год і Каляды і г.д.

# ПАДТРЫМКА ВЕТЭРАНАЎ ПРАЦЫ

ААТ “Савушкін прадукт” праводзіць актыўную работу па падтрымцы ветэранаў працы і пенсіянераў арганізацыі. Традыцыйна 1 кастрычніка ў кампаніі адзначылі Дзень пажылога чалавека. Ветэраны працы прыйшлі ў гэты дзень на прадпрыемства, каб пагутарыць са сваімі калегамі, убачыць, як расце і развіваецца кампанія. Многія з іх адправіліся на экскурсію па вытворчасці, іншыя вырашылі паглядзець прэзентацыю і фільм пра кампанію, даведацца пра яе поспехі і памкненні



1 кастрычніка - Дзень пажылога чалавека, виншаванне ветыранаў працы кампаніі

У завяршэнне Дня пажылога чалавека ветэраны працы сустрэліся за святочным сталом у душэўнай атмасферы. Да свята пенсіянеры атрымалі віншаванні і матэрыяльную дапамогу. Свята прайшло ў Брэсце, а таксама ў Пінску, Століне, Камянцы. Не засталіся ў баку і ветэраны ў Бярозе, Іванаве, Івацэвічах і ў Маларыце.



А да навагодніх і калядных свят у рамках акцыі “Чарада добрых спраў” кампанія “Савушкін прадукт” арганізавала віншаванне ветэранаў працы, якія пражываюць самотна і з'яўляюцца інвалідамі I, II, III групы або ляжачымі хворымі. Супрацоўнікі кампаніі сумесна са старшынёй Савета ветэранаў арганізацыі павіншавалі з надыходзячымі святамі ветэранаў працы і ўручылі ім падарункі.





# Ахова навакольнага асяроддзя

3

# АХОВА НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ



Наша кампанія беражліва ставіцца не толькі да перапрацоўкі малака, якое да нас паступае, але і да захавання навакольнага асяроддзя

Кампанія “Савушкін прадукт” надае вялікую ўвагу ахове навакольнага асяроддзя і кіруецца ў сваёй дзейнасці міжнароднымі прынцыпамі ў гэтай галіне:

- дзелавыя колы павінны падтрымліваць падыход да экалагічных пытанняў, заснаваны на прынцыпе засцярогі;
- дзелавыя колы павінны прадпрымаць ініцыятывы, накіраваныя на павышэнне адказнасці за стан навакольнага асяроддзя;
- дзелавыя колы павінны садзейнічаць развіццю і распаўсюджванню экалагічна бяспечных тэхналогій.

Наша кампанія беражліва ставіцца не толькі да перапрацоўкі малака, якое да нас паступае, але і да захавання навакольнага асяроддзя. Вытворчасць у нашай кампаніі безадходная. Сёння кампанія “Савушкін прадукт” цалкам перапрацоўвае “пабочныя прадукты вытворчасці” (сырную і тварожную сыроватку і маслёнку), ператвараючы іх у. Збору і перадачы на далейшую перапрацоўку падлягаюць: незабруканкурэнтны і запатрабаваны на рынку тавар. За 2019 год кампанія перапрацавала 758 тысяч тон сыроваткі.
“Савушкін прадукт” пільна сочыць за экалагічнасцю сваёй вытворчасці, мінімізуючы шкодныя выкіды ў атмасферуджаныя адходы кардону, поліэтылену, полістыролу, ПЭТ-бутэлькі, адпрацаваныя свінцовыя акумулятары з нязлітым электралітам, сінтэтычныя і мінеральныя маслы адпрацаваныя, лом і адходы чорных, каляровых металаў, драўняныя адходы і інш.

# АХОВА НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

**У кампаніі ўкаранёныя і функцыянуюць:**

**- Сістэма кіравання навакольным асяроддзем (СКНА) у адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў СТБ ІСО 14001-2017, ISO 14001:2015.**
**- Нацыянальны сертыфікат адпаведнасці №BY / 112 06.01.074 00043 ад 08.04.2005 г. выдадзены РУП "Экалогіяінвест", штогод праводзіцца інспекцыйны кантроль для пацвярджэння адпаведнасці.**
**- Міжнародны сертыфікат адпаведнасці № BY 228715E-U ад 10.11.2006г. выдадзены ЗТАА "Бюро Верытас", штогод праводзіцца інспекцыйны кантроль для пацвярджэння адпаведнасці.**

**У адпаведнасці з патрабаваннямі Сістэмы кіравання навакольным асяроддзем для зніжэння негатыўнага ўздзеяння вытворчай дзейнасці арганізацыі на навакольнае асяроддзе штогод вызначаюцца мэтавыя і планавыя экалагічныя паказчыкі, распрацоўваюцца мерапрыемствы ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, накіраваныя на ўкараненне рэсурсазберагальных і энергазберагальных тэхналогій, рацыянальнае выкарыстанне матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў.**



ВАЖНА!
-расход электраэнергіі на 1 тону сыравіны (кВт.г.):
2018 – 52, 2019 – 50;
-расход вады на 1 тону сыравіны (м3):
-2018 – 2,8, 2019 – 2,3

# АХОВА НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ



У кампаніі “Савушкін прадукт” дзейнічае палітыка ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі працы

У кампаніі “Савушкін прадукт” дзейнічае палітыка ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі працы, дзейнасць арганізацыі грунтуецца на выкананні наступных абавязацельстваў:

- выконваць заканадаўчыя і іншыя патрабаванні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі працы, прымяняльныя да дзейнасці арганізацыі;
- укараняць мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне ўмоў працы і павышэнне ўзроўню бяспекі працы, зніжэнне рызыкі вытворчых траўм і прафесійных захворванняў, папярэджанне і зніжэнне негатыўнага ўздзеяння вытворчай дзейнасці арганізацыі на навакольнае асяроддзе;
- пастаянна праводзіць аналіз, удасканальваць эфектыўнасць сістэмы кіравання навакольным асяроддзем, менеджменту аховы здароўя і бяспекі працы, прадастаўляць неабходныя сродкі і рэсурсы для забеспячэння функцыянавання сістэм;
- праводзіць працу па вызначэнні, ацэнцы, кіраванні і зніжэнні рызык у галіне аховы здароўя і бяспекі працы, экалагічных аспектаў;
- прыцягваць персанал арганізацыі да актыўнага ўдзелу па рэалізацыі мэтаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі працы;
- удасканальваць тэхналагічныя працэсы, укараняць рэсурсазберагальныя і энергазберагальныя тэхналогіі, імкнуцца да рацыянальнага выкарыстання матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў;
- пастаянна павышаць кваліфікацыю персаналу арганізацыі на аснове бесперапыннага працэсу навучання ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі працы;
- весці адкрыты дыялог з персаналам арганізацыі і грамадскасцю аб сваёй дзейнасці ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі працы;
- даводзіць патрабаванні палітыкі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі працы да ведама персаналу арганізацыі, падрадчыкаў, усіх зацікаўленых бакоў.

# АХОВА НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

Штогод у ААТ "Савушкін прадукт" распрацоўваецца план мерапрыемстваў па ахове навакольнага асяроддзя, у 2019 годзе былі выкананы ў поўным аб'ёме наступныя мерапрыемствы:

• праведзены вытворчыя экалагічныя назіранні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў — істотных парушэнняў не выяўлена;

• праведзены аналітычны кантроль у галіне АНА (замеры выкідаў забруджвальных рэчываў ад стацыянарных крыніц выкідаў, замеры выкідаў забруджвальных рэчываў ад мабільных крыніц выкідаў, кантроль эфектыўнасці работы лакальных ачышчальных збудаванняў сцёкавых вод, замеры скідаў забруджвальных рэчываў у складзе сцёкавых вод, якія адводзяцца ў сістэмы каналізацыі, замеры забруджвальных рэчываў у атмасферным паветры на мяжы санітарна-ахоўнай зоны);

• праведзены інструментальны кантроль эфектыўнасці працы газаачышчальных установак арганізацыі, у тым ліку вытворчых філіялаў, перавышэнняў не выяўлена.



Штогод у ААТ "Савушкін прадукт" распрацоўваецца план мерапрыемстваў па ахове навакольнага асяроддзя



# Супрацьдзеянне карупцыі

4

# СУПРАЦЬДЗЕЯННЕ КАРУПЦЫІ



Кампанія "Савушкін прадукт" падтрымлівае дзелавыя адносіны з вялікай колькасцю арганізацый Беларусі і замежжа

Кампанія "Савушкін прадукт" падтрымлівае высокія этычныя стандарты вядзення бізнесу, клапоціцца аб сваёй дзелавой рэпутацыі і выкарыстоўвае ў сваёй дзейнасці метады, якія заснаваны на прынцыпах адкрытасці і гуманнасці, а таксама прызнаныя сусветнай супольнасцю:

Дзелавыя колы павінны змагацца супраць усіх формаў карупцыі, уключаючы вымагальніцтва і хабарніцтва.

Мы вядзём сумленную і празрыстую практыку дзелавых адносін, прытрымліваемся маральных нормаў вядзення бізнесу, выбудоўваючы доўгатэрміновыя і стабільныя адносіны з усімі зацікаўленымі бакамі, заснаваныя на ўзаемным даверы, поўным выкананні абавязацельстваў і адкрытасці.

Кампанія імкнецца да стварэння і падтрымання карпаратыўнай культуры, заснаванай на даверы, культуры, якая прадугледжвае нецярпімасць да ўсіх праяваў карупцыі, уключаючы вымагальніцтва, хабарніцтва, а таксама недапушчэнне з'явы "чорных выплат" супрацоўнікам. Заработная плата пералічваецца на банкаўскія карткі "Белаграпрамбанк", "Беларусбанк", "БелВЭБ" і "Альфа-банк".

"Савушкін прадукт" выступае за празрыстае вядзенне бізнесу і строгае захаванне патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства, а таксама заканадаўстваў усіх краін-партнёраў у галіне процідзеяння карупцыі.

Сёння кампанія "Савушкін прадукт" падтрымлівае дзелавыя адносіны з вялікай колькасцю арганізацый Беларусі і замежжа. І адносіны з імі будуюцца выключна на даверы і ўзаемнай павазе, а таксама на ўмовах выразнага выканання дамоўных абавязацельстваў. У кампаніі практыкуецца тэндэрная сістэма пры правядзенні закупак і заключэнні дагавора на аказанне паслуг. Усе разлікі са сваімі партнёрамі кампанія ажыццяўляе па безнаяўным разліку.

Празрыстая сістэма працы кампаніі "Савушкін прадукт" не дапускае магчымасці ажыццяўлення ашуканскіх дзеянняў з боку супрацоўнікаў і трэціх асоб. Маёмасць і грашовыя сродкі кампаніі выкарыстоўваюцца толькі для дасягнення мэтаў кампаніі.




# Сацыяльна адказны бізнес

5

# САЦЫЯЛЬНА АДКАЗНЫ БІЗНЕС

Кампанія “Савушкін прадукт” няўхільна прытрымліваецца асноўнай ідэі сацыяльна арыентаванга вядзення бізнесу: дасягненне камерцыйнага поспеху пры абавязковай умове павагі і захавання агульначалавечых каштоўнасцей.

У сваёй дзейнасці наша кампанія прытрымліваецца міжнародных прынцыпаў у галіне правоў чалавека:

• дзелавыя колы павінны падтрымліваць і паважаць абарону абвешчаных на міжнародным узроўні правоў чалавека;
• дзелавыя колы не павінны быць датычныя да парушэнняў правоў чалавека.

Штодзённая задача кампаніі — у захаванні даверу спажыўцоў, якое пачынаецца з прадастаўлення прадуктаў самай высокай якасці і выдатнага смаку, адкрытасці перад спажыўцамі і партнёрамі.

У 2005 годзе ААТ “Савушкін прадукт” стала арганізатарам маштабнай рэспубліканскай сацыяльнай ініцыятывы “Савушкін — за здароўе нацыі”. Штогод яна папаўняецца самымі разнастайнымі сацыяльнымі праектамі, асноўная мэта якіх — клопат пра здароўе беларусаў праз папулярызацыю прынцыпаў здаровага харчавання з акцэнтам на яго важны складнік — натуральныя малочныя прадукты і прасоўванне здаровага ладу жыцця.



Кампанія “Савушкін прадукт” няўхільна прытрымліваецца асноўнай ідэі сацыяльна арыентаванга вядзення бізнесу

# КЛУБ ЭКСПЕРТАЎ МАЛАКА

У 2019 годзе кампанія "Савушкін прадукт" запусціла праект "Клуб экспертаў малака". У яго межах на працягу года штомесяц праводзіліся сустрэчы ўдзельнікаў клуба, трапіць на якія мог кожны жадаючы. Тэматыка праекта — ад фармавання агульнага ўяўлення пра сучасныя тэхналогіі ў малочнай вытворчасці да ўмення выбіраць карысныя прадукты і правільна чытаць этыкетку.

"Савушкін прадукт" запусціў праект, каб прыцягнуць увагу спажыўцоў да праблем ЗЛЖ і правільнага харчавання. А таксама даць людзям правераную інфармацыю аб малочных прадуктах і іх ролі ў здаровым ладзе жыцця.

Кожны ўдзельнік клуба змог бясплатна праслухаць майстар-клас ад практыкуючага ўрача, разам з галоўным тэхнолагам кампаніі наведаць экскурсію на вытворчасць "Савушкін прадукт" і даведацца, як вырабляюцца малочныя прадукты, а таксама пакаштаваць карысныя стравы ад прафесійнага шэф-повара аднаго з брэсцкіх кафэ, пагутарыць і атрымаць у падарунак кулінарную кнігу аб карыснай ежы. Перад гасцямі выступілі медыкі — тэрапеўт, педыятр, стаматолаг, анколаг, кардыёлаг, нефролаг, эндакрынолаг, дэрматолаг. Урачы распавялі пра ўплыў малочных прадуктаў на арганізм чалавека, іх карысць для здароўя.

По выніках года "Клуб экспертаў малака" наведалі каля 300 чалавек. Удзельнікі змаглі перагледзець свае погляды на малочныя прадукты і іх значэнне для добрага функцыянавання арганізму, пераканаліся ў неабходнасці іх спажывання для здароўя, убачылі, як вырабляюцца прадукты ў нашай кампаніі.




Раней кампанія "Савушкін прадукт" праводзіла праект "Клуб аматараў малака", у які "Савушкін прадукт" прымаў тых, у каго ёсць пытанні да малочных прадуктаў. У 2019 годзе аматары сталі сапраўднымі экспертамі.



# АДКРЫТАЯ ТРЭНІРОЎКА TEOS

“Адкрытая трэніроўка TEOS” — гэта гадавы праект бясплатных трэніровак па розных напрамках фітнесу. Кампанія “Савушкін прадукт” і сетка фітнес-клубаў “Адрэналін” аб'ядналі намаганні дзеля прасоўвання сярод беларусаў ідэй здаровага ладу жыцця і правільнага харчавання.

На працягу года адзін раз у месяц у адным з гарадоў Беларусі (Мінск, Гомель, Брэст, Ваўкавыск, Пінск, Лунінец, Орша) праходзіла адкрытая бясплатная трэніроўка, а разам з ёй гутарка з прафесійным трэнерам аб пабудове правільнага рацыёну харчавання. Прыняць удзел у ЗЛЖ-праекце мог кожны, каму цікавы спорт і правільнае харчаванне. Інфармацыя аб кожнай будучай трэніроўцы, а таксама форма для рэгістрацыі за 2 тыдні да старту размяшчаліся ў сацыяльных сетках кампаніі “Савушкін прадукт”.

Кожная новая трэніроўка была арганізавана ў новым напрамку (Step Interval — чаргаванне класічнай стэп-аэробікі з сілавымі практыкаваннямі, Functional Workout, Mix Functional Training — комплекс для павышэння спрыту, вынослівасці і каардынацыі рухаў, тай-бо, зумба, Fitness Mix з розных праграм і напрамкаў фітнесу, кругавая трэніроўка і г.д.)



Пачатак “Адкрытай трэніроўкі TEOS” — ажыўленая дыскусія з трэнерам аб харчаванні, затым — паўнавартасная групавая фітнес-трэніроўка, пасля — зносіны і дэгустацыя TEOS. Праект прыцягнуў у 3 разы больш удзельнікаў, чым гэта патрабавалася па фармаце. А яшчэ блогераў і журналістаў — яны з радасцю прыходзілі на кожную трэніроўку.

Па выніках года трэніроўкі наведалі больш за 300 чалавек. Сутнасць праекта — расказаць людзям, як лёгка і даступна весці здаровы лад жыцця. Арганізатары справіліся са сваёй задачай: дапамаглі ўдзельнікам ўмацаваць сваё здароўе, стаць больш упэўненымі ў сабе і больш шчаслівымі. таму пацверджанне.

# ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ ПАРКА МІРУ






Кампанія “Савушкін прадукт” правяла вялікую працу па добраўпарадкаванні парка Міру ў Брэсце паблізу галаўнога офіса кампаніі. Парк у 2019 годзе прыкметна змяніўся і стаў выдатным падарункам да 1000-годдзя горада.

Пасля добраўпарадкавання ў парку Міру стала камфортна сем'ям з дзецьмі, актыўнай моладзі, людзям сярэдняга і сталага ўзросту. Кампанія “Савушкін прадукт” прыклала максімум намаганняў, каб захаваць зялёную зону і папоўніць яе новымі раслінамі. Устаноўлены спартыўны комплекс, гульнявыя пляцоўкі для дзяцей і дарослых. Парк Міру стаў адным з самых папулярных месцаў для адпачынку ў горадзе.

Дзіцячы гарадок “Планета СуперКід” у парку Міру значна пашырыўся: цяпер ён складаецца з дзвюх пляцовак, уваход на якія пазначаны светлавой аркай. Кампанія “Савушкін прадукт” арганізавала спартыўную пляцоўку з workout-зонай пад адкрытым небам. Для падлеткаў паставілі 3 трэнажоры, для дарослых — 10. Пасля актыўнай трэніроўкі наведвальнікі могуць зрабіць “спартовае” сэлфі ў актыўнай фотазоне.

У парку з'явілася пляцоўка для заняткаў петанк. Таксама парк папоўнілі 30 новых лавачак, 2 велапаркоўкі, навес ад дажджу, арт-аб'ект “Глобус”, таксама высаджаны 69 дрэў, больш за 2300 кустоў, 36 квітнеючых мнагалетнікаў, пасеяна больш за 28 тыс м. кв. газона.

А да Новага года “Савушкін прадукт” ператварыў парк Міру ў чароўны лес: у парку ўсталявалі 12-метровую ёлку, арганізавалі мноства зон з яркімі казачнымі персанажамі, навагоднімі гірляндамі ўпрыгожылі дрэвы і ліхтары. Усяго ў парку было ўстаноўлена 28 аб'ектаў са святочнай падсветкай, а 68 дрэў ўпрыгожаны светлавымі гірляндамі агульнай працягласцю больш за 20 км

# МАЛОЧНЫ ФЭСТ

6-8 верасня горад Брэст адсвяткаваў сваё 1000-годдзе. Кампанія “Савушкін прадукт” пры падтрымцы Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта 30 жніўня адкрыла святкаванне гэтага юбілею сямейным фестывалем “Аблокі малака” у парку Міру.

Фестываль “Аблокі малака” сабраў у Брэсце рэкордную колькасць удзельнікаў — каля 50 тысяч чалавек. Кампанія “Савушкін прадукт” падрыхтавала ў парку Міру алею майстроў і сыраварню, малочны ўніверсітэт, спартыўныя і дзіцячыя зоны з дзясяткамі актыўнасцей. Малочны фестываль стаў найбуйнейшым у Еўропе. “Аблокі малака” наведаў прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Румас.

Фестываль прырос у гасцях на чвэрць у параўнанні з 2018 годам. Большасць удзельнікаў — з Брэста, многія таксама прыехалі з Мінска і іншых гарадоў. Са сталіцы пусцілі бясплатныя “малочныя экспрэсы”: іх пасажыры пабывалі і на свяце, і на вытворчасці.






*“Фестываль малака ўжо стаў візітнай карткай Брэста. А зараз мы хочам зрабіць яго славутасцю ўсёй краіны. Так, у Еўропе шмат сырных фестываляў, але вось сярод малочных наш — самы вялікі. Важна, што ён застаецца менавіта сямейным святам, якое папулярызуе здаровы лад жыцця”,* — адзначыў генеральны дырэктар кампаніі “Савушкін прадукт” Аляксандр Васільевіч Саўчыц.

# МАЛОЧНЫ ФЭСТ



Фестываль правялі з асаблівым размахам: парк Міру разбілі на пяць тэматычных зон, вакол якіх размясціўся вялікі фудкорт. Дзецям і дарослым былі даступныя каля 50 розных актыўнасцей. Многія інсталяцыі былі прысвечаны 1000-годдзю Брэста. Так, у гістарычнай зоне "Брест-Литовск" можна было пабываць у 19-м стагоддзі: прайсціся па алеі майстроў, схадзіць у тэатр ці старадаўні рэстаран. Многія пазіравалі ў рэтракары, кружылі ў танцах "залатога стагоддзя" і спасцігалі навыкі сыравара.

У зоне "Савушкин" працаваў малочны ўніверсітэт, дзе паказалі ўвесь працэс вытворчасці прадуктаў. Кожны жадаючы мог закасаць рукавы і падаіць карову, а спрыт жалезных рук праявілі робаты-афіцыянты. Моладзь з захапленнем займалася спартыўнымі танцамі і фітнесам у зоне TEOS. Самыя актыўныя спаборнічалі ў кінэктгульнях і чаканілі мяч з футбалістам "Дынама-Брэст".

Для дзяцей на тэрыторыі "СуперКид" уладкавалі лабірынт, батуты і скаладром. Хлопцы рабілі стыльныя шкляначкі для малака, малявалі і бавіліся. У зоне "Юкки" можна было заплесці двухмятровую касу, пабудаваць вежу з цэглы ці прыгатаваць марозіва, патрапіўшы ў вялікі вафельны стаканчык "малочным" шарам.

На сцэне ўвесь дзень выступалі кавер-бэнды, танцавальныя і дзіцячыя калектывы. А вячэрні канцэрт сабраў разам вядомых выканаўцаў. Завяршылася свята магутным светлавым шоў з маляўнічым феерверкам.

Малочны фэст у 4-ы раз правяла кампанія "Савушкін прадукт" пры падтрымцы Брэсцкага гарвыканкама да 1000-годдзя горада. Штогадовае мерапрыемства накіравана на папулярызацыю культуры актыўнага сямейнага адпачынку, здаровага ладу жыцця і спажывання натуральных малочных прадуктаў.

# ДЗЕНЬ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

Кампанія “Савушкін прадукт” праводзіць палітыку адкрытасці і падтрымлівае дыялог са спажыўцамі. 17 кастрычніка 2019 года “Савушкін прадукт” правёў для ўсіх жадаючых Дзень адчыненых дзвярэй, падчас якога ў кампаніі пабывала 450 гасцей.

Госці на свае вочы ўбачылі працэс прыёмкі малака, пабывалі ў лабараторыі, дзе свежае малако правяраюць на адпаведнасць якасці па 50-ці параметрах, ацанілі ўзровень тэхнічнага і тэхналагічнага абсталявання, санітарныя ўмовы ўсіх вытворчых працэсаў. А яшчэ атрымалі адказы на ўсе іх пытанні і пераканаліся ў тым, што вытворчасць малочнай прадукцыі ў кампаніі “Савушкін прадукт” ажыццяўляецца ў стэрыльных умовах: у замкнёным цыкле, практычна ўвесь працэс аўтаматызаваны.





Пасля экскурсіі наведвальнікаў чакаў смачны працяг — дэгустацыя навінак. Прыемна, што ўсе госці пасля мерапрыемства сыходзілі ўражаныя і ўпэўненыя, што “Савушкін прадукт” выпускае выключна якасныя і смачныя малочныя прадукты!

У 2019 годзе ў ААТ “Савушкін прадукт” было арганізавана каля 80 экскурсій і выстаў-дэгустацый для дэлегацый і гасцей кампаніі.

# РАБОТА З ГРАМАДСКІМІ СМІ

Для кампаніі важна меркаванне кожнага. Спажыўцы маюць права і магчымасць атрымліваць поўную і дакладную інфармацыю пра дзейнасць і прадукцыю кампаніі.
З мэтай шырокага інфармавання спажыўцоў пра важнасць здаровага харчавання і ролю ў ім малочных прадуктаў, адказаў на актуальныя пытанні, павышэння лаяльнасці спажыўцоў кампанія “Савушкін прадукт” у 2019 годзе актыўна працавала з самымі папулярнымі і рэйтынгавымі сродкамі масавай інфармацыі. Гэта размяшчэнні ў “Камсамольскай праўдзе ў Беларусі” (самай тыражнай газеце краіны), газеце “СБ. Беларусь сёння”, на інтэрнэт-пляцоўках tut.by, Бінокль.by, Смачны блог, у эфіры тэлеканала “АНТ”, на тэлеканалах Белтэлерадыёкампаніі, у эфірах радыёстанцый “Брэст”, “Радыус ФМ”, “Юністар” і г.д.






Таксама праводзілася рэгулярная інфармацыйная і асветніцкая праца на старонках кампаніі ў сацыяльных сетках “ВКонтакте”, “Facebook”, “Odnoklassniki”, “Інстаграм”. Там заўсёды можна атрымаць актуальную інфармацыю аб кампаніі, прадукцыі, правільным харчаванні і карысці малочных прадуктаў, даведацца пра самыя апошнія падзеі жыцця кампаніі.

У кампаніі працуе “Гарачая лінія” (тэлефон, электронная пошта, форма зваротнай сувязі на афіцыйным сайце кампаніі — дадзеныя указаныя на кожнай упакоўцы прадукта). Спажыўцы могуць выказаць свае пажаданні, меркаванні, задаць пытанні аб прадукцыі і дзейнасці кампаніі ў цэлым.

# МІШЛЕНАЎСКІЯ ПАВАРЫ і FORUM.CHEFS.BY

17-18 верасня ў Мінску адбылася буйная канферэнцыя “FORUM.CHEFS.BY”, на якой выступілі рэстаратары, бартэндэры і павары з 8 краін і прынялі ўдзел больш за 400 чалавек. У рамках форуму топавыя шэф-павары з Францыі, Германіі, Іспаніі, Японіі і Расіі наведалі вытворчасць кампаніі “Савушкін прадукт”, каб убачыць, як гатуюцца папулярныя беларускія малочныя прадукты і ацаніць іх смак.

У Брэст прыехалі французскі рэстаратар з мішленаўскай зоркай Бруна Дынэль, японскі шэф Ташыюкі Сакамота, які гатаваў для каралеўскіх сем'яў, іспанскі шэф і прафесар па ферментацыі Дыега Прада, расійскія рэстаратары Іван і Сяргей Беразуцкія — заснавальнікі рэстарана Twins Garden (19 месца ў рэйтынгу The World's 50 Best Restaurants 2019) і Юлія Камп з Германіі, якая атрымала зорку “Michelin” у 27 гадоў.

У кампаніі знакамітых гасцей чакаў сняданак-дэгустацыя, дзе яны пакаштавалі і стравы, і базавыя малочныя прадукты, з якіх яны гатаваліся. Госці з задавальненнем прадэгуставалі дранікі, сырнікі, блінцы, тварожнік з соусамі з грэчаскага ёгурту, а таксама выдатныя сыры, тварог, масла, смятану і сам ёгурт “Teos”. Смак прадуктаў прыемна здзівіў павароў. Напрыклад, ёгурт спадабаўся ўсім, нездарма ён атрымаў Crystal Award і Тры залатыя зоркі Superior Taste Award (прэстыжнага міжнароднага дэгустацыйнага конкурса). Шэфы адзначылі, што выкарыстоўвалі б яго на кухнях сваіх рэстаранаў.



*“У Еўропе няма такой разнастайнасці малочных прадуктаў, ды і на смак яны кіслейшыя,* — падзяліўся рэстаратар Сяргей Беразуцкі. — *А мне падабаецца мяккі сметанковы смак вашай малочкі, ён звыклы для славянскіх краін. Калі мы ехалі ў Беларусь, мы дакладна ведалі, куды едзем. І на што тут варта звярнуць увагу — на малочку: яна ў вас вельмі смачная і якасная!”*

# ПРЫЗНАННЕ СПАЖЫЎЦОЎ І ЭКСПЕРТАЎ




Гран-пры прэміі і званне "Брэнд — здабытак рэспублікі" атрымаў "Савушкін прадукт"

*Брэнд года.* Найлепшыя брэнды краіны выбіралі спажыўцы і прафесійнае журы. Усе гандлёвыя маркі ацэньваліся па двух фактарах — веданне і перавага. У агульнанацыянальным апытанні прынялі ўдзел мужчыны і жанчыны ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў. Усіх іх прасілі не абраць са спісу, а назваць брэнды, якія яны ведаюць і аддаюць перавагу.

На гэты раз пераможцаў вызначылі ў чатырох намінацыях і больш чым у 100 катэгорыях. У конкурсе ўдзельнічалі як беларускія, так і замежныя брэнды. Гран-пры прэміі і званне "Брэнд — здабытак рэспублікі" атрымаў "Савушкін прадукт". Ён жа стаў пераможцам у трох прадуктовых катэгорыях: малочная прадукцыя, ёгурты і сыры.

"Савушкін прадукт" таксама ўзяў "золата" як "Сацыяльна адказны брэнд", стаўшы пераможцам у катэгорыі "Актыўная сацыяльная пазіцыя". Кампанія "Савушкін прадукт" штогод рэалізуе дзясяткі сацыяльных праектаў. Іх мэта — данесці дакладную і карысную інфармацыю пра здаровы лад жыцця, правільнае харчаванне і ролю малочных прадуктаў у рацыёне чалавека.

"Брэнд года" з'яўляецца першым у Беларусі прафесійным конкурсам у сферы маркетынгу і брэндынгу. Конкурс праводзіцца ўжо 17 гадоў і збірае сотні ўдзельнікаў у розных катэгорыях.

# ПРАДЭКСПА – 2019

Апошні месяц зімы — традыцыйна час для найбуйнейшага ў СНД форуму харчовай прамысловасці — міжнароднай выставы “Прадэкспа” і дэгустацыйных конкурсаў у яе рамках. Вось ужо 26 гадоў вядучыя эксперты даюць сваё прафесійнае заключэнне, прысуджаючы ўзнагароды толькі найлепшым прадуктам сусветнай індустрыі харчавання, прадстаўленым на расійскім рынку.

Найлепшыя прадукты вызначалі на аснове іх якасці, смаку, знешняга выгляду і дызайну ўпакоўкі. Узоры прадукцыі вытворцы падавалі падчас правядзення выставы, а іх ацэнкай займалася конкурсная камісія. Пераможцаў выбіралі ў дзясятках намінацый — ад хлеба да сыроў. Конкурс мае міжнародны статус, а яго арганізатарамі выступаюць Мінсельгас Расіі і Рассельгаснагляд.

Расійскія эксперты адзначылі сыр “Брест-Литовск финский” і грэчаскі ёгурт “TEOS” з кіноа і семечкамі. Таксама журы ацаніла дзіцячы ёгурт “СуперКид” з ваніллю і шакаладнымі цукеркамі. Гэтыя прадукты прынеслі “Савушкін прадукт” статус лаўрэата конкурса і 3 залатыя медалі. Яшчэ адно золата і дыплом I ступені за высокія спажывецкія ўласцівасці атрымаў плаўлены вэнджаны сыр “Брест-Литовск”.



# SUPERIOR TASTE AWARD




Самыя высокія патрабаванні, крытэрыі ацэнкі, якія нідзе не публікуюцца, поўная ананімнасць — у міжнародным дэгустацыйным конкурсе Superior Taste Award ўсё заклікана аб'ектыўна выбіраць найлепшых

Малочныя прадукты кампаніі "Савушкін прадукт" ўвайшлі ў лік найлепшых у свеце на прэстыжнай дэгустацыі Superior Taste Award ў Брусэлі, дзе ўдзельнічалі сотні знакамітых шэф-повараў з усяго свету. Тры залатыя зоркі — найвышэйшую ўзнагароду конкурса з рук мэтраў высокай кухні атрымаў грэчаскі ёгурт "TEOS". Залатых зорак таксама ўдастоены сыры і тварог кампаніі "Савушкін прадукт".

Ужо 6 гадоў запар кампанія "Савушкін прадукт" удзельнічае ў самым рэйтынгавым міжнародным дэгустацыйным конкурсе "Superior Taste Award", штогод атрымліваючы найвышэйшыя ўзнагароды і ацэнку мэтраў высокай кухні. У 2019 годзе ў склад прафесійнага журы ўвайшлі каля 200 шэф-повараў з самых аўтарытэтных міжнародных асацыяцый і рэстаранных гідаў Michelin і Gault Milau асабістыя кухары Брытанскай каралевы і прэзідэнта Францыі.

Грэчаскі ёгурт "TEOS" 4 гады запар пакарае прафесійнае журы, штогод заваёўваючы максімальна высокія ўзнагароды: "Тры залатыя зоркі" (з трох магчымых). Прадукт амбіцыйна накіраваны на атрыманне Brilliant Taste Award. Апошнюю ўручаюць толькі тым прадуктам, якія 7 раз на працягу 10 гадоў становяцца ўладальнікамі Прэміі "За выдатны смак" і адзначаюцца "Трыма залатымі зоркамі". А "TEOS" ужо валодае прэстыжнай узнагародай конкурса — Crystal Taste Award за стабільна высокую якасць і выключны смак.

Еўрапейскім шэф-поварам таксама спадабаўся сыр "Брест-Литовск выдержанный", які атрымаў "Дзве залатыя зоркі". Залатой зоркі конкурса ўдастоена і сырная навінка кампаніі "Брест-Литовск Пинский".
Цікавы факт, нават незвычайная для Еўропы катэгорыя прадуктаў — класічныя тварагі — таксама не засталася незаўважанай. За добры смак рассыпісты тварог "Савушкин хуторок" адзначаны "Залатай зоркай" галоўнага дэгустацыйнага конкурса.

Самыя высокія патрабаванні, крытэрыі ацэнкі, якія нідзе не публікуюцца, поўная ананімнасць — у міжнародным дэгустацыйным конкурсе Superior Taste Award ўсё заклікана аб'ектыўна выбіраць найлепшых. А узнагароды — зоркі "Superior Taste Award" ужо даўно сталі найвышэйшай формай прызнання, як для кампаніі-вытворцы, так і для краіны, якую яны прадстаўляюць.

# КОНКУРСЫ

*Найлепшыя тавары.* Дыплом за “Стабільную якасць” і званне лаўрэата конкурса “Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь 2018” былі прысвоены і ўручаны кампаніі “Савушкін прадукт” Дзяржаўным камітэтам па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь у рамках Міжнароднага форуму-выставы дзелавых кантактаў “Брэст-2019”, які прайшоў 11 красавіка. “Найлепшымі таварамі” на рынку Беларусі прызнаныя сыры паўцвёрдыя “Брест-Литовск”, масла “Брест-Литовск”, ёгурт “СуперКид”, узбагачаны кальцыем і вітамінам D, з цукеркамі з малочнага шакаладу.

Дарэчы, у дадатак да найвышэйшай узнагароды конкурса ёгурт “СуперКид” адзначаны статусам “Навінка года”!







*“Сто дарог экспарту”.* Яшчэ адна ўзнагарода ў скарбонку кампаніі — найвышэйшая ўзнагарода конкурса “Сто дарог экспарту” падчас V Экспартнага форуму “Беларусь малочная”, які прайшоў 17-19 красавіка ў Мінску. Экспартны форум — найбуйнейшая ў краіне сустрэча вытворцаў і экспарцёраў малочнай прадукцыі з патэнцыяльнымі аптовымі пакупнікамі і экспертамі сусветнага рынку малака.

Прадукцыя кампаніі “Савушкін прадукт” прадстаўлена ў больш чым 30 краінах свету. У Расіі, напрыклад, больш за ўсё любяць наша малако, тварог, цвёрдыя сыры, дэсерты і грэчаскія ёгурты TEOS. Дарэчы, TEOS з'яўляецца абсалютным лідарам у катэгорыі грэчаскіх ёгуртаў на рынку Расіі.

# КОНКУРСЫ І ВЫСТАВЫ

*Белагра — 2019.* Гран-Пры і найвышэйшая ўзнагарода — Дыплом І ступені Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь уручаны кампаніі “Савушкін прадукт” на цырымоніі ўзнагароджання найлепшых удзельнікаў Міжнароднай спецыялізаванай выставы “Белагра-2019”. На плошчы больш за 75 000 м.кв. у выставе прынялі ўдзел 560 кампаній з 29 краін. Колькасць наведвальнікаў выставы перавысіла 65 тысяч чалавек. Асаблівае месца заняла экспазіцыя “Савушкін прадукт”, дзе кожны жадаючы мог пазнаёміцца з навінкамі кампаніі, а спецыялісты, якія працавалі на стэндзе, максімальна падрабязна адказалі на ўсе пытанні ад гасцей выставы.






*Малочны поспех-2019.* Тварожны легкі сыр “Савушкин” узяў Гран-пры міжнароднага конкурса “Малочны поспех-2019” у Сочы. Незалежныя дэгустатары таксама назвалі найлепшым навінку кампаніі “Савушкін прадукт” — сыр “Брест-Литовск финский”. Сярод лаўрэатаў апынуліся 9-працэнтны тварог “Савушкин хуторок” і грэчаскі ёгурт “TEOS” з чарніцай.

Усяго ў конкурсе ўдзельнічалі 30 вытворцаў з розных краін. Імі было прадстаўлена 127 найменняў малочных прадуктаў. “Малочны поспех” традыцыйна праходзіць у рамках Міжнароднай канферэнцыі ЕАЭС па вытворчасці і перапрацоўцы малака. Арганізатарамі выступае Малочны саюз Расіі (РСПМГ) пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі.

# НАРОДНАЯ МАРКА

У Беларусі ў 7-ы раз абралі найлепшыя харчовыя брэнды. Пераможцаў вызначылі шляхам народнага галасавання ў рамках Прэміі спажывецкага прызнання “Народная марка”. Гран-пры харчовых тавараў у чарговы раз заваявала прадукцыя кампаніі “Савушкін прадукт”, якая перамагла таксама ў 6 асноўных катэгорыях: традыцыйныя малочныя прадукты, ёгурты, тварожныя дэсерты, цвёрдыя сыры, тварожныя сыры і плаўленыя.

Народнае галасаванне доўжылася каля месяца. Арганізатары прэміі распаўсюдзілі каля 2 млн анкет і апыталі амаль 3 тыс. чалавек ва ўсіх рэгіёнах краіны. Пытанні не ўтрымлівалі варыянтаў адказаў — рэспандэнты самі называлі свае любімыя гандлёвыя маркі.

Самым любімым сярод усіх вытворцаў прадуктаў харчавання беларусы назвалі “Савушкін прадукт”, які з велізарным лікавым адрывам — больш чым у 5 разоў — абышоў іншыя гандлёвыя маркі, прадстаўленыя на рынку краіны, атрымаўшы амаль 22% галасоў. Прадукцыю кампаніі абраў кожны пяты ўдзельнік галасавання. Акрамя Гран-пры, найлепшыя прадукты харчавання выбіралі таксама па 61 катэгорыі. “Савушкін прадукт” стаў абсалютным лідарам, перамогшы ў 6 асноўных катэгорыях малочных прадуктаў.

“Народная марка” — гэта адзіны беларускі конкурс, дзе няма прафесійнага журы, а спажыўцы самі выбіраюць сваіх фаварытаў сярод вытворцаў. Свае ж перавагі яны аддаюць тым, каму давяраюць і каго могуць рэкамендаваць сваім блізкім. Кампанія “Савушкін прадукт” па праве можа ганарыцца тым, што на працягу ўсяго перыяду правядзення прэміі “Народная Марка” беларускі спажывец адзначае яе прадукцыю найвышэйшымі ўзнагародамі, уключаючы Гран-пры.




Прадукцыю кампаніі абраў кожны пяты ўдзельнік галасавання.

## Алена Бабкіна

## дырэктар па сувязях з грамадскасцю кампаніі «Савушкін прадукт»

Тэл .: +37517 394 92 97
+37529 161 63 65
e-mail: elena@savushkin.by